bipart
Belarusian Institute for Public Administration Reform and Transformation
The art of public administration

PUBLIC ADMINISTRATION NEWS DIGEST № 99, 2026

## Public Administration in Belarus in November - December 2025

**This issue provides an overview of key developments in November–December 2025, including: a further blurring of roles within the state "vertical"; the growing prominence of the security forces in Belarus's foreign relations; the appointment of former KGB officers to lead the security services; the new Social and Economic Development Programme; and an extensive reshuffling within local authorities, state-owned enterprises, economic ministries, and the diplomatic corps.**

## Дзяржаўнае кіраванне ў Беларусі ў лістападзе - снежні 2025 г.

**У гэтым нумары прадстаўлены агляд ключавых падзей лістапада – снежня 2025 г., у тым ліку ўсё большае размыццё роляў у дзяржаўнай «вертыкалі», вядучая роля сілавых структур у замежных кантактах Беларусі, прызначэнне былых супрацоўнікаў КДБ на высокія пасады ў сілавых структурах, новая Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця і перастаноўкі ў мясцовых органах улады, дзяржаўных прадпрыемствах, Міністэрстве эканомікі і дыпламатычным корпусе.**

Public administration news (November - December 2025)




## Key 2025 trend in Belarusian public administration: a blurring of roles within state "vertical"

In 2025 Aliaksandar Lukashenka further blurred institutional boundaries to reinforce his personal control over the political system, say analysts. This was evident during the preparation of Belarus's 2026–2030 development programme: two competing drafts were produced simultaneously, one by the government under Prime Minister Aliaksandar Turchyn and another at the National Bank headed by former prime minister Raman Halouchanka.

This overlap reflects  a broader pattern observed during the year. Lukashenka increasingly relied on ad-hoc commissions that bypass formal institutions and side-lined the Foreign Ministry, transferring diplomatic functions to security officials. The head of the KGB, Ivan Tsertsel, was given a role in talks with the US. Furthermore, Lukashenka expanded the remit of the prosecutor's office, which now has a role in ideology and education, and assigned the police responsibility for a range of issues from public order to queues at petrol stations.

Experts argue this mixing of competences reflects Lukashenka's growing distrust of formal institutions and his reliance on personal loyalty from officials. By assigning officials tasks beyond their formal mandates, he weakens institutional autonomy and ensures that they depend on his personal orders rather than legal procedures, reinforcing his position as the system's sole arbiter.

## De-institutionalisation of foreign policy: the security services and Lukashenka's family more active

Belarus's foreign policy and diplomacy are increasingly driven by the security services rather than the Ministry of Foreign Affairs (MFA).

Following a meeting with the US in December, 123 political prisoners were released, including prominent opposition figures. Lukashenka's press service said that the releases followed agreements with US President Donald Trump and were linked to the lifting of US sanctions on Belarus's potash sector, as well as broader negotiations on easing restrictions. Washington, meanwhile, confirmed it is working on securing further releases of hostages through negotiations. On the Belarusian side, talks involved KGB chief Ivan Tsertsel and the country's ambassador to the UN Valiantsin Rybakou. On 24 December, KGB head Tsertsel gave an interview to a state media in which he discussed intelligence contacts with the US, Poland, and Lithuania – he also promised "good news" in talks with Washington. Analysts note that the KGB has effectively become a key diplomatic actor, reinforcing the dominance of the security apparatus over traditional foreign policy institutions.

Tensions with Lithuania escalated in November after Vilnius closed border crossings in response to repeated incidents involving balloons smuggling cigarettes, floated across the border from Belarus. On 15 November, Prime Minister Aliaksandar Turchyn and Security Council State Secretary Aliaksandar Valfovich chaired a meeting on the situation. In attendance were the Minister of Foreign Affairs Maxim Ryzhankou, the head of the State Border Committee Kanstantsin Molastau, head of the State Customs Committee Uladzimir Arlouski, and head of the KGB Tsertsel. The group repeatedly pushed for political-level negotiations with Vilnius, with the MFA tasked to lead negotiations under the coordination of Valfovich.

Lukashenka's foreign trips further underscored his disregard for having formal institutions handle foreign relations. His November visit to Oman

took place largely outside formal diplomatic protocol, fuelling speculation about whether private or family interests might be the primary reason for the trip. Lukashenka arrived with no public agenda, was initially received by the President of the Oman Investment Agency, and met the sultan days later in a private setting. Notably, only Lukashenka and his sons Viktar and Mikalai (who do not hold any official public position) attended the talks, without the presence of Belarusian diplomats.

## Personnel changes in state agencies

### Former KGB officials appointed to lead key juridical institutions and security agencies

#### New Prosecutor General

Lukashenka has appointed Dzmitry Hara as the new Prosecutor General, replacing Andrei Shved who was moved to the Supreme Court. Born in 1970 in Tbilisi (Georgia), Hara has served in senior roles in the KGB, the Prosecutor General's Office, and since 2021 he has led the Investigative Committee. In 2020, independent media reported that Hara headed the "intergovernmental commission" which was meant to investigate citizens' complaints about abuses of power by Lukashenka's security forces – obviously, to no result.

The Prosecutor General's Office is expected to continue political repressions, targetting those the state accuses of causing the "genocide of the Belarusian people". It is also expected to become a "headquarters", taking over some powers currently held by the Security Council apparatus; this might specifically refer to it gaining a role in Belarus-West talks, which were the main topic for the recent meeting on 9 December.

### Combating corruption as priority for Prosecutor General's Office

Another task for Hara will be to combat corruption, a key theme in the Lukashenka regime's propaganda campaigns. Earlier, the Prosecutor General's Office floated new ideas to strengthen the fight against corruption through stricter legislation. On 30 December state media reported that a new plan to combat crime and corruption for 2026–2028, drafted by the Prosecutor General's Office, was adopted jointly with the Council of Ministers. Agriculture has been identified as the most corruption-prone sector, followed by industry, transport, and construction. Interior Minister Ivan Kubrakou acknowledged setbacks in the detection of corruption in 2025, but said that Interior Ministry officers have shifted focus from petty bribery to dismantling systemic "business" corruption schemes.

While Lukashenka always talks about the prevention of corruption as a major priority, anti-corruption investigations often lower-level officials within the state hierarchy, businessmen or workers of state-run organisations rather than the big players. "High-profile cases" do appear, but regime elites have only rarely been arrested. For example, in 2022, independent media reported on the "Case of traumatologists", where dozens of doctors were detained for what seemed like the result of a poorly designed procurement policy.

According to Supreme Court data reported on by independent media, during the first half of 2025, there were 7.3% fewer convictions for corruption crimes than in the same period in 2024. Belarusian officials seem to find creative ways of avoiding criminal responsibility. For

example, independent media noted the case of the former mayor of the town of Dokshytsy: previously cleared of responsibility in a fatal hunting incident, he has once again avoided legal consequences following a new case linked to alleged poaching.

## New head of the Investigative Committee

Kanstantsin Bychak was appointed Kanstantsin Bychak as the new head of the Investigative Committee. Bychak was previously the deputy chief of the KGB's investigative directorate and one of its most visible figures within the Committee, regularly appearing on state media to comment on high-profile political cases. Bychak is also known for his participation in political persecutions. Independent media report that, in November 2024, he personally travelled to Vietnam to detain former Kalinouski regiment volunteer Vasyl Verameichyk. In 2020 he  publicly presented the details of a politically motivated corruption case against presidential hopeful Viktar Babaryka. Bychak is 40 years old and was promoted to the rank of major general of justice after his new appointment. Based on research on the career paths of Belarusian security forces personnel, Lukashenka has regularly appointed former KGB officers to senior roles in the Investigative Committee, suggesting he considers them among the best suited to run criminal prosecution for political purposes after 2020.

Analysts see the recent reshuffling in Belarus's security apparatus as reflecting a growing importance of the KGB in the competition for influence among the security forces. One indication of this is the KGB's role in ongoing contacts between Minsk and Washington. Another explanation might be Lukashenka's personal attitude towards the KGB. Finally, these appointments also serve as a tool of loyalty management.

The regular reshuffling of the leadership in key security agencies is likely aimed at pre-empting the formation of cliques and dissent within them. Lukashenka could be especially anxious about this at a time when he is taking controversial policy steps, such as the recent prisoner releases and talks with the West, and he mentioned this issue during his speech at the All-Belarusian People's Assembly. Analysts note that the head of the KGB, Ivan Tsertsel, has held his current position for five years already, which is relatively long and may make him a prime candidate for rotation.

These appointments might also signal a functional recalibration inside the repressive system. While repressions have not eased, there seems to be a downgrading of blunt-force bodies, such as GUBOPiK, in favour of institutions capable of operating more discreetly, through surveillance, manipulation, and controlled pressure rather than mass violence. The background of Lukashenka's talks with the West contribute to the political weight of the KGB compared to other repressive structures. Recently, an illustrative case was reported by independent media: a murder inside a police detention facility in Barysau has triggered a rare criminal investigation against a serving police officer, exposing the use of so-called "press cells*" to extract confessions. The investigation was quickly taken over by the KGB who arrested two suspected inmates and later detained a police officer. The entire leadership of the Barysau district police department was dismissed, though most senior officers avoided arrest. The case highlights the KGB's role in policing other security agencies, even as broader political repression continues unchanged.

** "Press cells" are a type of torture used by Belarusian security forces, referring to deliberately created, unbearable conditions set up by the administration of a pre-trial detention centre. In these harsh conditions, cellmates cooperating with the authorities force confessions out of a fellow detainee.*

## Changes in the judiciary

On 19 December, during the All-Belarusian People's Assembly, the heads of the Supreme Court and the Constitutional Court were replaced. 83-year-old Valiantsin Sukala and 71-year-old Piotr Miklashevich have been relieved of their posts as Chairmen of the Supreme and Constitutional Courts, respectively, due to their retirement. The changes marked a generational transition at the top of the courts, explained by the senior age of previous appointees and the need for rotation.

### New chairman of the Supreme Court

The new head of Lukashenka's court system, Andrei Shved, rose from a relatively low-profile legal official to one of the leading figures in Belarus after being appointed prosecutor general in 2020. His career has spanned the prosecutor's office, the Security Council, the Investigative Committee, and the State Forensic Committee. He was involved in high-profile politicised criminal cases (including the investigation into the 2011 Minsk Metro bombing), the Belarusian war on drugs in the 2010s, and has faced indirect allegations of covering up corruption linked to the elites. As prosecutor general, he openly backed harsh crackdowns on protesters and dissenters after 2020, pushed for expanded "extremism" laws, ignored complaints of police violence, and oversaw politically motivated cases. He also spearheaded propaganda initiatives such as the "genocide of the Belarusian people" investigation and heads the commission vetting political emigrants seeking to return. In December 2020, the European Union sanctioned Shved, citing his responsibility as prosecutor general for the ongoing repression of civil society and the democratic opposition.

While formally a "promotion", Shved's new appointment likely stems from the need to change the leadership of the Prosecutor General's Office as part of Lukashenka's tactic for preventing officials at the top of key security institutions from strengthening their positions in the political system.

### New head of the Constitutional Court

Siarhei Sivets was appointed head of the Constitutional Court. Previously a senator, the staunch regime loyalist proposed – during the peak of protests in 2020 – politically motivated fines for people who used "unregistered" symbols such as the national white-red-white flag. Independent media sources describe Sivets as a pragmatic careerist who serves the system while primarily advancing his own interests. For example, Sivets sent his son to study military intelligence at Russia's GRU academy but quickly brought him back after the full-scale war began, fearing his son's mobilisation.

Lukashenka suggested more actively using the Constitutional Court in drafting and reviewing legislation, in order to "create better laws so that they don't have to be changed as often." In practice, this likely means the continuation of the Constitutional Court being little more than a decorative state body, designed to process Lukashenka's constitutional referendums. The previous head of the Constitutional Court, Piotr Miklashevich, had held the position since 2008 and was not particularly noteworthy, aside for having led the Constitutional Commission in preparation for the 2022 constitutional referendum.

### Broader reshuffles in the judiciary

On 20 December, Lukashenka signed a decree which reshuffled the

country's judiciary. Yury Kobets will head a new judicial body, the Appellate Economic Court, which will start its work in 2026 and will hear appeals in business-related economic disputes while also overseeing the lower economic courts. Aliaksandar Lisouski and Eduard Karol were appointed as Chairs of the Economic Courts of the Homiel and Hrodna regions, respectively. Several judges were relieved of their previous posts following their election to the Supreme Court.

### Changes in the local authorities, industry, economic ministries and diplomatic corps

On 20 November, Lukashenka approved appointments of new heads of six district executive committees in Vitsebsk, Mahilyou and Minsk regions. Lukashenka repeated his standard propaganda message to the new appointees, stressing the personal responsibility of local authorities for basic results, particularly in the prevention of livestock losses, and warning that failure to handle these elementary tasks would result in dismissal.

In the sphere of economic regulation, Lukashenka approved new appointments at the Ministry of Antimonopoly Regulation and Trade: Natallia Vasileuskaya was appointed First Deputy Minister, while Aleh Dzikun became Deputy Minister. These appointments likely constitute a regular rotation of staff.

### New appointments in state-run companies

In the industrial sector, Taras Muroh was appointed as the new general director of the Minsk Tractor Works (MTZ), one of the country's large state owned enterprises. The leadership at MTZ was likely changed due to underperformance: in December independent media reported that, according to leaked internal documents, Belarus's Ministry of Industry has reprimanded the managers of several flagship state-owned manufacturing enterprises for failing to meet KPIs. The harshest punishment was meted out to the previous MTZ General Director Siarhei Auramenka. The reason for the reprimand was reportedly the failure to achieve targets for exports, sales profitability and fixed capital investment, as well as "insufficient performance in implementing special investment contracts in the Russian Federation". MTZ management were stripped of all bonuses and allowances for one month. The new director of MTZ, Muroh, previously held the position of General Director of "Belkommunmash" and was also reprimanded for missing export targets in that role; his performance, nevertheless, did not prevent his new appointment.

### New appointments in the diplomatic corps

Dzmitry Krasouski, who already serves as ambassador to Kenya and Uganda, was named Ambassador to Ethiopia concurrently. Siarhei Malinouski was appointed Ambassador to Montenegro, also a concurrent appointment as he retains his post as Ambassador to Serbia and North Macedonia. There are also two new consuls general: Aliaksandar Shauchenka in Shanghai, and Dzianis Meleshkin in Almaty. Lukashenka reiterated that diplomats must actively promote Belarus's economic interests abroad, underscoring the current position of the MFA as being more of a foreign trade ministry within the state system.

## Official documents and legislation

### Social and economic development programme for 2030

On 19 December, the All-Belarusian People's Assembly unanimously approved the country's social and economic development programme for 2026–2030. The programme outlines seven priorities, relating to demographics, education, living standards, technological development, regional growth, defence and the arms industry, and tourism. Notably, previous programmes did not list defence as a separate focus in social and economic development.

Earlier in November, the Belarusian government had approved a new list of state programmes for 2026–2030. These shift priorities towards security and tourism, whilst reducing attention on public health, according to an independent media report. Several programmes focused on the security bloc remain or have been expanded, including initiatives run by the Interior Ministry, Defence Ministry, State Security Committee, and the state military-industrial sector. A number of health-related programmes that existed in the previous cycle have been dropped.

Experts at Kosht Urada (Cost of State) outline several shortcomings in the programmes adopted. For example, the government's new employment programme, "A Balanced Labour Market," focuses on secondary factors such as ageing, skills mismatches, and youth career guidance, whilst avoiding the core issue of mass emigration of skilled Belarusians from the country after 2020.

Another relevant example includes the government's new entrepreneurship programme, aimed at improving the business environment and supporting the growth of small and medium-sized enterprises. Independent media note that the key feature in the initiative is its financing structure: almost the entire cost will be borne by banks. This approach aligns with the regime's broader stance on the banking sector: Lukashenka has repeatedly stated that bank profits should be directed towards financing the economy.

## News of BIPART and Kosht Urada (Cost of Government)




On 16 December, BIPART Research Centre published a study, "Technocrats under Pressure: Career Trajectories and State Control in Economic Ministries of Belarus," examining the institutional structure and personnel policy of the government's economic bloc from 2005 to 2025.

In November 2025, experts from BIPART, as part of the project team for "Investigating Good Governance in the Context of Authoritarian Consolidation: The Case of Belarus (InGAC)" at Vilnius University, presented an analysis showing how the principles of good governance were introduced and interpreted in the country between 2014 and 2025.

Belarus’s quarterly Charka-Shkvarka Index for Q3 2025 shows that rising wages are masking growing distortions in the economy, and IT workers are no longer the highest earners. The index, which measures how many “sets” of vodka and pork cracklings an average salary can buy, rose to a record 652, up about 10% year on year. This reflects wage growth that far outpaces real economic performance. Analysts link the gap to labour shortages resulting from mass emigration, administrative pressure to raise wages, and a continued infusion of financial support from Russia. Pork prices jumped about 12% over the year, while vodka rose only 5%, meaning Belarusians can afford more alcohol but less meat.

## Навіны дзяржаўнага кіравання (лістапад – снежань 2025 г.)




### Тэндэнцыя 2025 года ў дзяржаўным кіраванні Беларусі: размыццё роляў унутры дзяржаўнай «вертыкалі»

Паводле ацэнак экспертаў, Аляксандар Лукашэнка наўмысна размывае інстытуцыйныя межы, каб умацаваць свой асабісты кантроль над палітычнай сістэмай. Гэта стала відавочна падчас падрыхтоўкі праграмы развіцця Беларусі на 2026–2030 гады, калі адначасова былі падрыхтаваны два канкуруючыя праекты: адзін — урадам пры прэм'ер-міністры Турчыне, а другі — Нацыянальным банкам пад кіраўніцтвам экс-прэм'ера Рамана Галоўчанкі.

Гэтая накладка адлюстроўвае больш шырокую тэндэнцыю, якая назіралася на працягу года. Лукашэнка ўсё больш абапіраўся на спецыяльныя камісіі ў абыход фармальных інстытутаў: адсунуў на другі план Міністэрства замежных спраў, даручыўшы дыпламатыю сілавікам, у тым ліку перамовы з ЗША — кіраўніку КДБ Церцелю; пашырыў ролю пракуратуры на ідэалогію і адукацыю, а міліцыю паставіў кантраляваць чэргі на запраўках.

Па меркаванні экспертаў, такое змешванне роляў адлюстроўвае ўсё большы недавер Лукашэнкі да фармальных інстытутаў і стаўку на асабістую лаяльнасць. Даручаючы чыноўнікам задачы, якія выходзяць за рамкі іх мандатаў, Лукашэнка аслабляе аўтаномію палітычных інстытутаў і замацоўвае залежнасць ад яго асабістых загадаў, а не ад юрыдычных працэдур, што ўмацоўвае яго пазіцыю як галоўнага арбітра ўнутры сістэмы.

### Знешняя палітыка: адыход ад інстытутаў да сілавікоў і сям’і Лукашэнкі

Апошнія замежныя кантакты рэжыму характарызуюцца тым, што дыпламатыяй усё часцей займаюцца сілавікі, а не Міністэрства

замежных спраў.

Пасля сустрэчы з амерыканскім кіраўніцтвам у снежні былі вызваленыя 123 палітычныя зняволеныя, у тым ліку вядомыя апазіцыйныя дзеячы. Прэс-служба Лукашэнкі заявіла, што вызваленне адбылося пасля дасягнення дамоўленасцяў з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам, звязаных з адменай санкцый ЗША ў дачыненні да калійнага сектара Беларусі і больш шырокімі перамовамі аб змякчэнні абмежаванняў, у той час як Вашынгтон пацвердзіў, што працуе над далейшым вызваленнем закладнікаў. З боку Беларусі ў перамовах удзельнічалі кіраўнік КДБ Іван Церцель і прадстаўнік Беларусі пры ААН Валянцін Рыбакоў. 24 снежня Церцель даў інтэрв'ю дзяржаўным СМІ, дзе распавёў пра кантакты разведкі з ЗША, Польшчай і Літвой і паабяцаў «добрыя навіны» на перамовах з Вашынгтонам. Аналітыкі адзначаюць, што КДБ фактычна стаў ключавым гульцом беларускай дыпламатыі, умацоўваючы перавагу апарата бяспекі над традыцыйнымі інстытутамі знешняй палітыкі.

Напружанасць у адносінах з Літвой абвастрылася ў лістападзе пасля таго, як Вільнюс закрыў мяжу ў адказ на неаднаразовыя інцыдэнты, звязаныя з метэазондамі з кантрабандай з Беларусі. 15 лістапада адбылася сустрэча па сітуацыі пад старшынствам прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына і дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Аляксандра Вальфовіча. На сустрэчы прысутнічалі кіраўнікі Міністэрства замежных спраў Максім Рыжанкоў, Дзяржаўнага памежнага камітэта Канстанцін Моластаў, Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір Арлоўскі і кіраўнік КДБ Церцель. Беларускі бок спрабаваў уцягнуць Вільню ў перамовы на палітычным узроўні. Перамовы было даручана весці МЗС пад каардынацыяй кіраўніка Савета бяспекі Вальфовіча.

Замежныя паездкі Лукашэнкі ў лістападзе яшчэ раз падкрэслілі грэбаванне афіцыйнымі інстытутамі, якія займаюцца міжнароднымі адносінамі. Яго візіт у Аман адбыўся ў значнай ступені па-за межамі афіцыйнага дыпламатычнага пратакола, падмацоўваючы здагадкі пра тое, што прыватныя сямейныя інтарэсы пераважаюць дыпламатыю. Лукашэнка прыляцеў без публічна абвешчанага графіка, яго прыняў прэзідэнт Аманскага інвестыцыйнага агенцтва, а праз некалькі дзён ён сустрэўся з султанам у прыватнай абстаноўцы. Варта адзначыць, што на перамовах прысутнічалі толькі Лукашэнка і яго сыны Віктар і Мікалай (якія фармальна не займаюць дзяржаўных пасад), а беларускіх дыпламатаў на сустрэчы не было.

# Кадравыя змены ў дзяржаўных органах

## Былыя супрацоўнікі КДБ прызначаны кіраўнікамі ключавых юрыдычных устаноў і сілавых структур

### Новы генпракурор

Лукашэнка прызначыў Дзмітрыя Гару новым генеральным пракурорам, замяніўшы Андрэя Шведа, які быў пераведзены ў Вярхоўны суд. Гара, які нарадзіўся ў 1970 годзе ў Тбілісі (Грузія), мае бэкграўнд працы на кіруючых пасадах у КДБ, Генеральнай пракуратуры, а з 2021 года ўзначальваў Следчы камітэт. У 2020 годзе незалежныя СМІ паведамлялі, што Гара ўзначальваў «міжурадавую камісію», якая павінна была расследаваць скаргі грамадзян на перавышэнне паўнамоцтваў сілавікамі Лукашэнкі — відавочна, безвынікова. Лукашэнка чакае, што Генеральная пракуратура будзе працягваць палітычныя рэпрэсіі, выставіць

рахунак вінаватым у «генацыдзе беларускага народа», і стане цэнтральным «штабам», які возьме на сябе некаторыя паўнамоцтвы апарата Савета Бяспекі, што можа датычыць перамоў паміж Беларуссю і Захадам, якія былі галоўнай тэмай нядаўняй сустрэчы 9 снежня.

## Барацьба з карупцыяй як прыярытэт для пракуратуры

Яшчэ адной задачай для Гары будзе барацьба з карупцыяй, якую Лукашэнка рэгулярна выкарыстоўвае ў палітычных мэтах. Раней Генеральная пракуратура высунула новыя ідэі па большым пастрожанні карупцыйнага заканадаўства. 30 снежня дзяржаўныя СМІ паведамілі аб прыняцці сумесна з Саветам Міністраў новага пяцігадовага плана па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй на 2026–2028 гады, падрыхтаванага Генпракуратурай. Сілавікі адзначаюць, што найбольш уразлівы для карупцыі сектар — гэта сельская гаспадарка, за ёй ідуць прамысловасць, транспарт і будаўніцтва. Міністр унутраных спраў Іван Кубракоў прызнаў няўдачы ў раскрывальнасці злачынстваў у 2025 годзе, але заявіў, што сілавікі пераключылі ўвагу з дробнага хабарніцтва на ліквідацыю сістэмнай «дзелавой» карупцыі.

Хоць Лукашэнка заўсёды кажа пра тое, што галоўным прыярытэтам з'яўляецца прадухіленне карупцыі, аб'ектамі такіх расследаванняў часта становяцца чыноўнікі ніжэйшага ўзроўню, бізнесмены або работнікі дзяржаўных арганізацый. Рэгулярна ўзнікаюць «вялікія справы», але арышты рэдка даходзяць да рэжымных эліт. Напрыклад, у 2022 годзе незалежныя СМІ паведамлялі пра «справу траўматолагаў», дзе дзясяткі лекараў былі затрыманыя за тое, што выглядала вынікам дрэнна распрацаванай палітыкі дзяржзакупак.

Паводле дадзеных Вярхоўнага суда, апублікаваных незалежнымі СМІ, у першай палове 2025 года  за карупцыйныя злачынствы было асуджана на 7,3% менш падазраваных, чым за аналагічны перыяд 2024 года. У той жа час беларускія чыноўнікі працягваюць знаходзіць крэатыўныя спосабы пазбегнуць крымінальнай адказнасці: у пачатку снежня незалежныя СМІ адзначылі справу былога мэра Докшыц, які раней быў апраўданы за ненаўмыснае забойства на паляванні і ў чарговы раз пазбег наступстваў пасля новай справы, звязанай з браканьерствам.

## Новы кіраўнік Следчага камітэта

Канстанцін Бычак быў прызначаны кіраўніком Следчага камітэта. Раней ён быў намеснікам начальніка следчага ўпраўлення КДБ і адным з самых публічных гэбістаў, рэгулярна з'яўляючыся ў дзяржаўных СМІ з каментарамі па гучных палітычных справах. Бычак таксама вядомы тым, што па інфармацыі незалежных медыя, у лістападзе 2024 асабіста ездзіў у В'етнам, каб затрымаць беларускага добраахвотніка Васіля Верамейчыка і публічна прадстаўляў палітычна матываваную справу КДБ аб карупцыі супраць банкіра Віктара Бабарыкі ў 2020 годзе. Бычаку 40 гадоў, і пасля новага прызначэння ён быў павышаны да звання генерал-маёра юстыцыі. Згодна з даследаваннем кар'ерных траекторый беларускіх сілавікоў, пасля 2020 года Лукашэнка рэгулярна прызначае былых супрацоўнікаў КДБ на кіруючыя пасады ў Следчым камітэце праз тое, што ён лічыць іх больш здольнымі да выкарыстання крымінальнага пераследу ў палітычных мэтах.

Аналітыкі мяркуюць, што перастаноўкі ў апараце бяспекі могуць

адлюстроўваць умацаванне пазіцый КДБ у канкурэнцыі за ўплыў паміж сілавікамі Лукашэнкі. Адзін з фактараў — важная роля КДБ у бягучых кантактах паміж Мінскам і Вашынгтонам. Другое тлумачэнне гэта асабістае стаўленне Аляксандра Лукашэнкі да КДБ: настальгія па савецкіх часах спрыяе «прэстыжу» і стратэгічнай важнасці структуры, што ўзмацняе давер Лукашэнкі да яе ў перыяды нявызначанасці.

Рэгулярныя перастаноўкі кіраўніцтва сілавых ведамстваў, верагодна, маюць на мэце прадухіліць утварэнне груповак і нязгоды ў сілавых структурах. Для Лукашэнкі гэта можа быць асабліва важна на фоне «спрэчных» крокаў, такіх як вызваленне палітзняволеных і перамовы з Захадам, што ён асобна згадаў падчас свайго выступу на Усебеларускім народным сходзе. Аналітыкі таксама адзначаюць, што кіраўнік КДБ Церцель займае сваю пасаду ўжо 5 гадоў, што можа зрабіць яго наступным лагічным кандыдатам на ратацыю.

Гэтыя прызначэнні могуць таксама сведчыць аб функцыянальнай перакаліброўцы ўнутры рэпрэсіўнай сістэмы. Нягледзячы на тое, што рэпрэсіі не спыняюцца, выглядае што назіраецца паніжэнне статусу такіх сілавых структур, як ГУБОПіК, на карысць установаў, здольных дзейнічаць больш дыскрэтна, праз сачэнне, маніпуляцыі і кантраляваны ціск, а не брутальную сілу. Фон перамоў Лукашэнкі з Захадам спрыяе палітычнай вазе КДБ у параўнанні з іншымі рэпрэсіўнымі структурамі. Незалежныя СМІ паведамілі пра паказальны выпадак: забойства ў «прэс-хаце» следчага ізалятара ў Барысаве стала прычынай рэдкай крымінальнай справы супраць супрацоўніка міліцыі. Расследаванне хутка ўзяў на сябе КДБ, які арыштаваў двух падазраваных зняволеных, а пазней затрымаў супрацоўніка міліцыі. Па выніку фактычна ўсё кіраўніцтва Барысаўскага раённага аддзела міліцыі адправілі ў адстаўку, хоць большасць з іх пазбеглі арышту. Гэты выпадак падкрэслівае ролю КДБ у кантролі за іншымі сілавымі структурамі, нават калі палітычныя рэпрэсіі працягваюцца без змен.

## Змены ў судовай сістэме

19 снежня падчас Усебеларускага народнага сходу адбылася замена кіраўнікоў Вярхоўнага суда і Канстытуцыйнага суда. 83-гадовы Валянцін Сукала і 71-гадовы Пётр Міклашэвіч былі зняты з пасад старшыні Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў. Змены кіраўнікоў судовай сістэмы, верагодна, тлумачацца ўзростам чыноўнікаў і неабходнасцю ратацыі.

## Новы старшыня Вярхоўнага суда

Новы кіраўнік судовай сістэмы Лукашэнкі Андрэй Швед прайшоў шлях ад малазначнага чыноўніка да прызначэння генеральным пракурорам у 2020 годзе. Яго кар'ера ахоплівае пракуратуру, Савет бяспекі, Следчы камітэт і Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. Ён расследаваў гучныя палітызаваныя крымінальныя справы (у тым ліку расследаванне выбуху ў мінскім метро ў 2011 годзе), змагаўся з наркотыкамі, а незалежныя медыя абвінавачвалі яго ў прыкрыцці карупцыі, звязанай з лукашэнкаўскімі элітамі. На пасадзе генеральнага пракурора, ён падтрымліваў жорсткія рэпрэсіі, выступаў за пашырэнне «экстрэмісцкага» заканадаўства, ігнараваў скаргі на гвалт з боку сілавікоў і курыраваў палітычна матываваныя справы. Ён таксама пачынаў прапагандысцкія ініцыятывы, такія як расследаванне «генацыду беларускага народа», і ўзначальвае камісію па праверцы палітычных эмігрантаў. У снежні 2020 года

Еўрапейскі Саюз увёў санкцыі супраць Шведа за працяглыя рэпрэсіі супраць грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай апазіцыі.

Нягледзячы на тое, што прызначэнне Шведа гэта фармальна «павышэнне», яно імаверна звязана з неабходнасцю змены кіраўніцтва Генпракуратуры ў межах тактыкі Лукашэнкі перашкаджаць кіраўнікам ключавых сілавых структур умацоўваць свае пазіцыі ў сістэме падчас доўгага знаходжання на пасадзе.

## Новы старшыня Канстытуцыйнага суда

Сяргей Сівец быў прызначаны кіраўніком Канстытуцыйнага суда. Раней сенатар і перакананы прыхільнік рэжыму, у пік пратэстаў у 2020 годзе ён прапаноўваў увесці штрафы для людзей, якія выкарыстоўваюць «незарэгістраваную» сімволіку, у тым ліку нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг. Незалежныя СМІ апісваюць Сіўца як прагматычнага кар'ерыста, які служыць сістэме, у першую чаргу прасоўваючы свае ўласныя інтарэсы. Напрыклад, Сівец адправіў свайго сына вучыцца ваеннай разведцы ў акадэмію ГРУ Расіі, але хутка вярнуў яго пасля пачатку поўнамаштабнай вайны, баючыся мабілізацыі. Лукашэнка прапанаваў больш актыўна выкарыстоўваць Канстытуцыйны суд пры распрацоўцы і пераглядзе заканадаўства, каб «ствараць дасканалыя законы, каб іх не трэба было так часта мяняць». На практыцы гэта, верагодна, азначае, што Канстытуцыйны суд будзе працягваць быць дэкаратыўным дзяржаўным органам, існуючым для легалізацыі канстытуцыйных рэферэндумаў Лукашэнкі. Папярэдні кіраўнік Канстытуцыйнага суда Пётр Міклашэвіч займаў гэтую пасаду з 2008 года і не быў асабліва прыкметным, за выключэннем кіраўніцтва Канстытуцыйнай камісіяй па падрыхтоўцы да рэферэндуму 2022 года.

## Іншыя перастаноўкі ў судовай сістэме

20 снежня Лукашэнка падпісаў указ аб прызначэнні і звальненні суддзяў. Юрый Кобец узначаліць новы судовы орган — Апеляцыйны гаспадарчы суд, які пачне працаваць у 2026 годзе і будзе разглядаць апеляцыі па эканамічных справах, а таксама кантраляваць ніжэйшыя гаспадарчыя суды. Аляксандр Лісоўскі і Эдуард Кароль былі прызначаны старшынямі гаспадарчых судоў Гомельскай і Гродзенскай абласцей адпаведна. Некалькі суддзяў былі вызвалены ад сваіх папярэдніх пасад пасля абрання ў Вярхоўны суд.

## Перастаноўкі ў мясцовых органах улады і міністэрствах

20 лістапада былі зацверджаны прызначэнні новых кіраўнікоў шасці райвыканкамаў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях. Лукашэнка паўтарыў сваю тыповую прапагандысцкую прамову для прызначаных: падкрэсліў, што кіраўнікі выканкамаў нясуць асабістую адказнасць за дасягненне асноўных вынікаў, у прыватнасці, у прадухіленні смяротнасці жывёлы, і папярэдзіў, што невыкананне элементарных задач прывядзе да звальненняў.

Лукашэнка зацвердзіў новыя прызначэнні ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю: Наталля Васілеўская была прызначана першым намеснікам міністра, а Алег Дзікун — намеснікам міністра. Гэтыя прызначэнні, верагодна, тлумачацца рэгулярнай ратацыяй кадраў.

## Перастаноўкі ў буйных дзяржаўных кампаніях

У прамысловым сектары Тарас Мурог быў прызначаны новым генеральным дырэктарам Мінскага трактарнага завода (МТЗ). Кіраўніцтва МТЗ, верагодна, памянялі праз невыкананне планаў па экспарце: у снежні незалежныя СМІ паведамілі, што згодна з уцечкай унутраных дакументаў, Міністэрства прамысловасці пакарала кіраўнікоў некалькіх дзяржаўных кампаній за невыкананне паказчыкаў эфектыўнасці. Найбольш жорсткае пакаранне было вынесена кіраўніцтву МТЗ, генеральны дырэктар Сяргей Аўраменка атрымаў вымову. Прычынай стала невыкананне планаў па экспарце, продажах і інвестыцыях, а таксама «недастатковае выкананне спецыяльных інвестыцыйных кантрактаў у Расійскай Федэрацыі», што прывяло да пазбаўлення кіраўніцтва МТЗ усіх прэмій і даплат за месяц. Новы дырэктар МТЗ Мурог раней займаў пасаду генеральнага дырэктара «Белкамунмаша» і таксама атрымаў вымову за невыкананне планаў па экспарце, што зусім не перашкодзіла яго новаму прызначэнню.

### Новыя прызначэнні ў дыпламатычным корпусе

Дзмітры Красоўскі быў прызначаны паслом у Эфіопіі па сумяшчальніцтве, ужо займаў пасаду пасла ў Кеніі і Угандзе. Сяргей Маліноўскі быў прызначаны паслом у Чарнагорыі па сумяшчальніцтве, захаваўшы пасаду пасла ў Сербіі і Паўночнай Македоніі. Два новыя генеральныя консулы: Аляксандр Шаўчэнка ў Шанхаі і Дзяніс Мелешкін у Алматы. Лукашэнка паўтарыў, што дыпламаты павінны актыўна прасоўваць эканамічныя інтарэсы за мяжой, падкрэсліўшы цяперашнюю пазіцыю МЗС як адказных за знешні гандаль у рамках дзяржаўнай сістэмы.

## Афіцыйныя дакументы і заканадаўства

### Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2030 год

19 снежня Усебеларускі народны сход аднагалосна зацвердзіў праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026–2030 гады. Пяцігадовая праграма акрэслівае сем прыярытэтаў, у тым ліку дэмаграфію, адукацыю, якасць жыцця, тэхналагічнае развіццё, развіццё рэгіёнаў, умацаванне абараназдольнасці, а таксама турызм. Прыкметна, што ў папярэдніх праграмах абарона не вылучалася асобным напрамкам.

Раней у лістападзе ўрад Беларусі зацвердзіў новы спіс дзяржаўных праграм на 2026–2030 гады, па якіх бачны зрух прыярытэтаў у бок сілавога блоку і турызму, у той час як увагі ахове здароўя паменела, паведамляюць незалежныя СМІ. Праграмы, арыентаваныя на сілавікоў застаюцца або пашыраюцца, у тым ліку ініцыятывы МУСа, Міністэрства абароны, КДБ і ваенна-прамысловага сектара. Разам з тым, шэраг праграм, звязаных з аховай здароўя, якія існавалі ў папярэднім цыкле, былі спыненыя.

Эксперты «Кошт урада» падкрэсліваюць недахопы прынятых праграм. Напрыклад, новая ўрадавая праграма занятасці «Збалансаваны рынак працы» сканцэнтравана на другасных фактарах, такіх як старэнне насельніцтва, неадпаведнасць кваліфікацыі патрабаванням і прафарыентацыя моладзі, пазбягаючы пры гэтым асноўнай праблемы: масавай эміграцыі кваліфікаваных спецыялістаў з Беларусі пасля 2020-га.

Яшчэ адзін прыклад — новая ўрадавая праграма развіцця прадпрымальніцтва, накіраваная на паляпшэнне бізнес-асяроддзя і

падтрымку росту малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Незалежныя СМІ адзначаюць, што ключавой асаблівасцю ініцыятывы з'яўляецца яе структура фінансавання: амаль усе выдаткі будуць пакрывацца банкамі. Гэты падыход адпавядае пазіцыі рэжыму ў дачыненні да банкаўскага сектара: Лукашэнка неаднаразова заяўляў, што прыбытак банкаў павінен быць адабраны і накіраваны на фінансаванне эканомікі.

## Навіны BIPART і Кошт урада




16 снежня Даследчы цэнтр BIPART прадставіў даследаванне «Тэхнакраты пад ціскам: кар'ерныя траекторыі і дзяржаўны кантроль у эканамічных міністэрствах Беларусі», у якім разглядаецца інстытуцыйная структура і кадравая палітыка эканамічнага блока ўрада ў 2005–2025 гадах.

У лістападзе 2025 года эксперты BIPART у складзе каманды праекта «Даследаванне належнага кіравання ў кантэксце аўтарытарнай кансалідацыі: выпадак Беларусі (InGAC)» Віленскага ўніверсітэта прэзентавалі вынікі аналізу таго, як у 2014–2025 гадах у краіне ўкараняліся і інтэрпрэтаваліся прынцыпы належнага кіравання (good governance).

Штоквартальны індэкс «ЧаркаШкварка» ў Беларусі за 3 квартал 2025 года паказвае, што рост заробкаў маскіруе ўзрастаючыя супярэчнасці ў эканоміцы, і IT-спецыялісты больш не з'яўляюцца лідарамі па заробках. Індэкс, які паказвае, колькі «набораў» чарак і шкварак можна купіць на сярэдні заробак, вырас да рэкордных 652, што прыкладна на 10% больш, чым у мінулым годзе. Гэта адлюстроўвае рост заробкаў, які значна апярэджвае рэальныя эканамічныя паказчыкі. Аналітыкі звязваюць гэты разрыў з дэфіцытам працоўнай сілы ў выніку масавай эміграцыі, адміністрацыйным ціскам да павышэння заробкаў і працяглымі фінансавымі ўліваннямі з боку Расіі. Кошты на свініну падскочылі прыкладна на 12% за год, у той час як гарэлка падаражэла толькі на 5%, што азначае, што беларусы могуць дазволіць сабе больш алкаголю, але менш мяса.